**Прыкладны план правядзення**
**Тыдня роднай мовы ва ўстанове дашкольнай адукацыі**

**ПАНЯДЗЕЛАК**

1. Для ўсіх узроставых груп:

**Экскурсія ў этнаграфічны пакой: «Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына»**

*Мэта*: працягваць далучаць дзяцей да гісторыі нацыянальнай культуры беларускага народа, паглыбіць прадстаўленні аб прадметах вясковага побыту (традыцыйныя вырабы з дрэва, саломкі), прыладах працы; падтрымліваць цікавасць да багацця роднай культуры, мовы.

**АЎТОРАК**

1. Старэйшая група:

**- Занятак-забава на тэму «Па старонках роднай мовы» з выкарыстаннем твораў вуснай народнай творчасці.**

*Мэта*: паказаць прыгажосць і багацце моўнай спадчыны беларускага народа праз розныя віды дзіцячага фальклору: вершаванага, празаічнага, гульнявога, музычнага; выхоўваць пачуццё любові і зацікаўленнасці да роднага слова; далучаць дзяцей да вытокаў беларускай духоўнай культуры.

**- Беларускія народныя гульні на працягу дня ва ўсіх узроставых групах.**

*Мэта:* развіваць звязнае маўленне. Узбагачаць, актывізаваць і замацаваць слоўнік выхаванцаў. Развіваць слыхавую ўвагу дзяцей. Выпрацоўваць хуткасць рэакцыі на слова, увагу, кемлівасць, памяць.

2. Малодшая група:

**- Гульня-занятак на тэму «Жылі-былі дзед і баба»**

*Мэта:* прадоўжаць вучыць дзяцей адгадваць загадкі, адказваць на пытанні, развіваць мову, узбагаціць слоўнікавы запас, выхоўваць цікавасць да роднай мовы, жаданне размаўляць на ёй.

**СЕРАДА**

1. Старэйшая група:

**- Гутарка аб спарцменах-пераможцах на тэму «Гонар краіны» з выкарыстаннем матэрыялаў СМІ і праглядам слайдаў.**

*Мэта:* пашыраць прадстаўленні дашкольнікаў аб суайчынніках-пераможцах, выхоўваць пачуццё гонару за сваіх землякоў, выклікаць жаданне быць падобнымі на іх, развіваць звязнае маўленне.

2. Малодшая група:

**- Занятак-забаўлянка «Да нас у госці прыйшоў Каток – залаты лабок» па азнаямленню выхаванцаў малодшай узроставай групы з народнымі цацкамі.**

*Мэта:* знаёміць дзяцей з бедарускімі народнымі цацкамі, пабуджаць выхаванцаў да выражэння сваіх уяўленняў у самастойным апісанні цацак, раскрыць багацце і непаўторнасць роднай мовы, выклікаць жаданне выкарыстоўваць цацкі ў самастойнай гульнявой дзейнасці.

**ЧАЦВЕР**

1. Старэйшая група:

**- КВЗ «Мой родны кут як ты мне мілы» - па знаёмству з пасёлкам** (з праглядам відыяфільма)**.**

*Мэта:* паглыбляць прадстаўленні дзяцей пра наш пасёлак, славутых людзях і вядомых мясцінах. Фарміраваць цікавасць да мінулага і сучаснага пасёлка, выхоўваць павагу да гістарычнай і культурнай спадчыны, роднай мовы.

2. Малодшая група:

**- Гульня-занятак «Падарожжа ў казку» з выкарыстаннем розных відаў тэатра.**

*Мэта:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць казку, разумець змест казачнага тэксту, замацаваць сэнс і вымаўленне беларускіх слоў, развіваць навыкі дыялагічнага маўлення ў працэсе драматызацыі казкі, прывіваць выхаванцам навыкі звязнай гаворкі.

**ПЯТНІЦА**

1. Старэйшая група:

**- Свята «Сёння ў нашай хаце свята» з удзелам бацькоў і супрацоўнікаў дашкольнай установы.**

*Мэта:* раскрыць багацце і непаўторнасць роднай мовы, фарміраваць творчае мысленне, вучыць станоўча ставіцца да беларускай культуры.

2. Малодшая група:

**- Літаратурная забава «Матуліна калыханка».**

*Мэта:* пашыраць веды бацькоў аб фальклоры, аб яго значэнні для агульнага развіцця дзяцей, вучыць дзяцей эмацыянальна ўспрымаць калыханку, жаданне спяваць яе, і выкарыстоўваць у самастойных гульнях.